Салаўёў М.

# ЛЕЙТЭНАНТ КАРНАЧОНАК

**"Лётчык авіяцыйнага гвардзейскага палка лейтэнант Мікалай Карначонак заваяваў сабе вялікую славу пад Сталінградам. Цудоўная смеласць і непераймальнае ўменне вызначаюць гэтага маладога 20-гадовага лётчыка. Ён ваюе з першых дзён Айчыннай вайны і зарэкамендаваў сябе выдатным паветраным байцом. Яго самалёт 349 разоў узнімаўся ў паветра. У гарачых баях тав. Карначонак збіў асабіста 10 нямецкіх самалётаў, у тым ліку 7 бамбардзіроўшчыкаў".**

**("Правда" за 24 лістапада 1942 года)**

У тыя цяжкія і грозныя дні жорсткіх баёў на плошчах і вуліцах Сталінграда нямногія яго абаронцы ўдастоіліся такога высокага гонару, каб аб іх баявых подзвігах асобна пісала газета «Правда». Хто ж ён, лейтэнант Карначонак, які заслужыў такую . высокую ацэнку на старонках газеты Цэнтральнага Камітэта партыі?

Мікалай Аляксандравіч Карначонак – наш зямляк. Ён нарадзіўся ў 1922 годзе ў вёсцы Баркі Старасельскага сельсавета. У родным сяле закончыў школу і пераехаў разам з маці Ксеніяй Савельеўнай у Оршу. Працаваў там на мясакамбінаце, які цяпер носіць яго імя. У 1940 годзе Мікалая прызвалі на сапраўдную ваенную службу і накіравалі ў авіяцыйнае вучылішча. Лётчыкам-знішчальнікам прыбыў ён у 434 знішчальны авіяцыйны полк.

У ліпені грознага сорак першага лейтэнант Карначонак упершыню сустрэўся ў паветраным баі з фашысцкім паветраным піратам. Першы бой быў выйграны, але Мікалай поўнага задавальнення не атрымаў – яму не ўдалося збіць іварожы самалёт. Супакойвала падзяка, атрыманая на зямлі ад камандзіра эскадрыллі капітана І. І. Ізбінскага:

– Выдатна дзейнічалі, лейтэнант. Ваша смеласць выратавала мяне. Дзякуй!

Лейтэнант зачырванеўся ад такой пахвалы камандзіра і не зусім зразумеў, за што дзякуюць яму. Толькі пасля Карначонак пачаў успамінаць ход бою. Захоьдзячы ў атаку, ён убачыў, што ў хвост камандзірскай машыны цэліцца фашыст. Мікалай кінуў свій паслухмяны знішчальнік насустрач ворагу, які, баючыся сутыкнення з чырвоназоркавай машынай, рвануўся ўправа і трапіў пад смертаносную чаргу лётчыка Міхаіла Гарама.

У паўсядзённых баях мацнела і адтачвалася баявое майстэрства маладога лётчыка. Мікалая Карначонка па праву лічылі адным з лепшых знішчальнікаў палка, сапраўдным знатаком не толькі самалёта, але і тактыкі бою.

На баявым рахунку маладога лётчыка было ўжю чатыры збітых варожых самалёты і ён двойчы ўзнагароджваўся камандаваннем за зберажэнне матэрыяльнай часткі. Два разы вяртаўся Мікалай на свой аэрадром на такой машыне, якую па інструкцыі можна было пакінуць і выбрацца з парашутам. Камсамолец добра ведаў, як патрэбна кожная баявая машына ў палку, на фронце і, рызыкуючы жыццём, дацягваў да аэрадрома.

Карначонак ужо зрабіў каля дзеісяці баявых вылетаў на выратаванай ім адрамантаванай умелымі майстрамі машыне. У той дзень ён вярнуўся на свой аэрадром пад вечар і трапіў у абдымкі баявых сяброў.

– Вітаем, Мікалай!

– Малайчына, лейтэнант!

Мікалай нічога не мог зразу мецць. Хацеў далажыць камандзіру эскадрыллі капітану Ізбінскаму аб выкананні задання, а той перапыніў яго:

– Дакладвайце камандзіру палка.

Каля штабной зямлянкі стаяў маёр Кляшчоў – камандзір авіяцыйнага палка. Лётчык коратка рапартуе камандзіру.

– Таварыш маёр! Баявое заданне, выканана. У баю збіў яшчэ адзін варожы бамбардзіроўшчык.

– Выдатна, лёйтэнайт! Вітаю вас з пёрамогай і ад імя камандавання ўручаю вам баявую ўзнагароду – ордэн Чырвонага Сцягу.

Радасна забілася сэрца Мікалая. Трымаючы ў руках высокую ўзнагароду за ратныя подзвігі, лейтэнант толькі і змог адказаць:

– Служу Савецкаму Саюзу!

...Жорсткія бai грымелі на берагах Дона. Пад націскам пераўзыходзячых сіл ворага нашы часці адыходзілі на левы бераг ракі. Васьмёрка знішчальнікаў пад камандаваннем капітана Ізбінскага прыкрывала адну з пераправаў. Робячы разварот, Карначонак убачыў варожую эскадрыллю бамбардзіроўшчыкаў, якія ішлі да пераправы пад абаронай знішчальнікаў. Другую зграю сцярвятнікаў заўважыў Ізбінскі і падаў каманду:

– Чацвёрка Карначонка завязвае бой са знішчальнікамі, астатнія атакуюць "юнкерсаў".

Нашы самалёты атакавалі нечакана і імкліва. Тры бамбардзіроўшчыкі, пакідаючы чорны шлейф дыму, пайшлі да зямлі. На месцы, дзе яны ўпалі, прагучалі тры моцныя выбухі. Зноў атака. Яшчэ два самалёты з чорнымі крыламі не дацягнулі да мэты. Астатнія "юнкерсы", бясцэльна скінуўшы смертаносны груз, павярнулі назад. Ні адна бомба не трапіла на пераправу. У гэтым баі на рахунку Мікалая Карначонка паявіліся два збітых варожых знішчальнікі.

Пачаўся верасень 1942-га. Лётчыкі палка маёра Кляшчова базіраваліся на палявым аэрадроме паблізу Сталінграда і неслі патрульную службу над горадам.

Эскадрыллі капітана Ізбінскага загадалі тэрмінова падняцца ў паветра і перахапіць варожыя самалёты, якія неслі дзесяткі тон смертаноснага грузу на волжскую цвярдыню. Сустрэлі сцярвятнікау на подступах да Сталінграда. У першай жа атацы збілі два "юнкерсы". Мікалай атакаваў яшчэ адзін бамбардэіроўшчык праціўніка, але на яго коршунам наляцеў варожы знішчальнік. Выручыў баявы сябра Уладзімір Мікаян. Даўгая чарга яго кулямёта растрапала самалёт гітлераўца.

Самалёты насіліся ў смяротнай каруселі. Мікалай умела атакуе і знішчае чарговую варожую машыну.

У гэтым страшэнным баі Мікалай згубіў свайго лепшага баявога таварыша Уладзіміра Мікаяна...

21 верасня маёр Кляшчоў вярнуўся з штаба дывізіі і сабраў падначаленых.

– Нашы войскі пачынаюць наступленне. Заўтра раніцай полк у поўным саставе вылятае на прыкрыццё часцей, якія наступаюць у раёне станцыі Катлубань. Рыхтуйцеся, сябры і будзьце мужнымі!

...Апоўдні эскадрылля капітана Ізбінскага чацвёрты раз узнялася ў паветра. Каля сарака самалётаў сыйшліся ў жорсткім баі – лётчыкі эскадрыллі перахапілі варожыя бамбардзіроўшчыкі. Такога напору фашысты не чакалі і пачалі скідваць бомбы на пазіцыі сваіх войск.

Удалай была і пятая атака савецкіх сокалаў. Мікалай Карначонак, Міхаіл Гарам і Шышкін збілі аднаму самалёту і кінуліся на ўздагон варожых бамбардзіроўшчыкаў. Уперадзе – самалёт Карначонка. Мікалаем валодала адна думка: дагнаць і знішчыць ворага. З гэтай думкай ён і сустрэўся ў апошнім баі з некалькімі варожымі знішчальнікамі. Чырвоны сокал адбіваўся да апошняга патрона.

яго імя. кана

Некалькі варожых чэргаў прашылі фюзеляж самалета Карначонка і машына згубіла паслухмянасць. Мікалай ведаў, што ратунку няма. Апошнія яго словы развітання былі пасланы Радзіме, маці...

А маці мужнага лётчыка Ксенія Савельеўна, у апошнюю мінуту свайго жыцця, перанёсшы цяжкія пакуты фашысцкага засценка,

куды яна трапіла за сувязь з аршанскімі падпольшчыкамі, пасылала сваё апошняе прывітанне любімаму сыну Мікалаю.

Радзіма высока ацаніла ратныя подзвігі свайго вернага сына Мікалая Карначонка. Яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**Салаўёў, М. Лейтэнант Карначонак / М. Салаўёў // Ударны фронт (Шклоў). — 1973. — 10 ліпеня. — С. 3.**